# У гісторыка-краязнаўчым музеі раёна адбыліся адкрыццё пастаяннай экспазіцыі і паэтычны вернісаж

**У гэтыя студзеньскія дні ў Гомельскім гісторыка-краязнаўчым музеі адбылася значная падзея ў культурным жыцці нашага краю: адкрылася пастаянна дзеючая экспазіцыя "Літаратурнае аб'яднанне "Пралеска" Гомельскага раёна". Унікальнасць яе ў тым, што яна – адзіная ў вобласці.**




*– Гомельскі раён можа пахваліцца вялікай колькасцю таленавітых людзей – як ураджэнцаў, так і тых, чый працоўны лёс быў звязаны з гэтым куточкам беларускай зямлі,* – адзначыла дырэктар музея Кацярына Варабей.

На ўрачыстае адкрыццё запрасілі і ветэранаў педагагічнай

працы, якія нямала намаганняў падчас свайго настаўніцтва аддалі знаёмству дзяцей і падлеткаў з мілагучнай мовай вершаў і празаічных твораў вядомых класікаў і землякоў.

Таксама ў першыя дні студзеня родныя і землякі ўспамінаюць дзень нараджэння Івана Сяркова, якому сёлета споўнілася б 94 гады. Аўтар знакамітай трылогіі “Мы — хлопцы жывучыя” стварыў сапраўдную энцыклапедыю жыцця Пакалюбіч у часы Вялікай Айчыннай вайны. Ягоныя творы, напісаныя з гумарам, лёгка чытаюцца і сталі любімымі не аднаго пакалення беларусаў.

Кацярына Варабей азнаёміла ўдзельнікаў творчай вечарыны з літаратурнай спадчынай Івана Сяркова і прадэманстравала ўнікальныя архіўныя запісы пра абрад калядавання, зробленыя Іванам Кірэевічам для будучага твора на гістарычную тэматыку. А ягоны сын Андрэй Іванавіч падзяліўся некаторымі ўспамінамі пра бацьку і яго літаратурную працу.









Кіраўнік аб’яднання “Пралеска” Ева Дударга, ураджэнка Раманавіч, падзякавала дырэктару музея за падараваную

магчымасць стварыць экспазіцыю, прысвечаную землякам-літаратарам. Творцы мастацкага слова, многія з якіх уваходзяць у склад Саюза пісьменнікаў Беларусі, перадалі ў фонд музея шмат унікальных выданняў. У першую чаргу — трохтомны альманах “Пралеска”, першы з якіх быў надрукаваны больш за дзесяць гадоў назад.






А так як усё адбывалася падчас святкавання Старога Новага году, работнікі культуры з Пакалюбіч падаравалі гасцям аграгарадку некалькі прыемных хвілін – прадэманстравалі традыцыйны абрад калядавання.


sozhnews.by


estonia
sozhnews.by







*— Яшчэ ў 2009 годзе па ініцыятыве Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі была ўшанавана памяць нашага земляка: на*

*доме, дзе жыў Іван Сяркоў, адкрыта мемарыяльная дошка. А сёлета памятная дошка ў гонар знакамітага пісьменніка Васіля Ткачова з’явілася на ягоным доме,* – расказала Тамара Кручэнка, намеснік старшыні Гомельскага аддзялення Саюза пісмьеннікаў Беларусі.

Яна таксама зазначыла, што гэтая творчая сустрэча стала значнай падзеяй у літаратурным жыцці вобласці падчас Года сучаснай патрыятычнай мастацкай літаратуры, які праходзіць пад эгідай Года міру і стварэння.









Многія ўдзельнікі літаратурнага аб’яднання “Пралеска” скарысталіся магчымасцю, каб падзяліцца ўспамінамі пра

знакамітых землякоў, а таксама прачыталі свае творы.









У Аляксандра Атрушкевіча адзін з вершаў якраз і прысвечаны Пакалюбічам: у 1972 годзе ён, выпускнік вышэйшай навучальнай установы, быў накіраваны ў гэтыя мясціны для правядзення даследаў перад плануемай меліярацыяй.




Былы дырэктар Клімаўскай сярэдняй школы, ветэран педагагічнай працы Тамара Лявоненка падзялілася ўспамінамі аб дзейнасці па арганізацыі сустрэч з літаратарамі, а таксама па захаванні памяці пра ветэранаў вайны і працы.




Галіна Гузянкова, былая настаўніца Брылёўскай сярэдняй школы, Валерый Вятошкін, Тамара Кручэнка і многія іншыя літаратары былі ўдзячныя, што змаглі азнаёміцца з гісторыка-краязнаўчым музеем і адчуць сябе ў нейкай меры летапісцамі роднага краю, бо ў сваіх творах адлюстроўваюць ягоныя багацці.


sozhnews.by


МУЗЫКАЛЬНЫЙ
КАЛЕЙДОСКОП
МУЗЫКА
ВОКАЛ
ХОРЕОГРАФИЯ
sozhnews.by







**Ірына ГРАМЫКА.**

**Фота аўтара.**




Текст взят с сайта https://sozhnews.by/zhizn-rajona/u-gistoryka-krayazna-chym-muzei-rajona-adbylisya-adkrytstsjo-pastayannaj-ekspazitsyi-i-paetychny-vernisazh